# З НАДЫХОДЗЯЧЫМ НОВЫМ, 1996-ым ГОДАМ!



*У календары -- апошнія лісткі. Мы развітваемся з адыходзячым у гісторыю 1995-ым і сустракаем новы, 1996-ы год. У кожнага з нас -- свае пачуцці. Але ёсць у іх і штосьці агульнае. Перш за ўсё гэта ўсведамленне таго, што сёлетні год не прынёс чакаемых перамен. Ён праходзіў у складаных і напружаных сацыяльна-эканамічных умовах, пры адчувальным падзенні жыццёвага ўзроўню людзей.*

*Самым знамянальным з'явілася, бадай, адно: на фінішы года нарэшце ўдалося сфарміраваць вышэйшы заканадаўчы орган -- беларускі парламент. І цяпер застаецца спадзявацца, што з яго плённай законатворчай дзейнасцю адбудуцца зрухі ў лепшы бок.*

*Шчыра жадаем усім членам універсітэцкага калектыву ў Новым 1996-м годзе не траціць аптымізму, старанна працаваць і вучыцца, жыць з надзеяй на будучы дабрабыт. Усім Вам добрага здароўя, асабістага шчасця і сямейнай згоды!*

*А яшчэ жадаем мацнейшым спартсменам універсітэта выканаць устаноўленыя нарматывы і ўвайсці ў склад зборнай каманды Рэспублікі Беларусь, пад флагам якой пасняхова выступіць на чарговых летніх Алімпійскіх гульнях у Атланце.*

**РЭКТАРАТ, ПРАФКОМ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.**


ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



| № 19 (901) | ЧАЦВЕР, 28 снежня 1995 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|




## НА ПЛЕНУМЕ ГАЛІНОВАГА ПРАФСАЮЗА

6-га снежня адбыўся I пленум Беларускага рэспубліканскага камітэта работнікаў адукацыі і навукі. Асноўным на парадку дня было пытанне "Аб рабоце камітэтаў прафсаюза вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў па абароне інтарэсаў навучэнцкай моладзі, стварэнні неабходных умоў для іх працы і быту".

У рабоце пленума ад нашага універсітэта прынялі ўдзел старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі і старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава, якая выступіла ў спрэчках пры абмеркаванні заслуханага даклада старшыні БРК галіновага прафсаюза Т.І.Чобатавай.

Аб выніках работы пленума Н.І.Колтышава далажыла на пасяджэннях прафкомаў універсітэта.

## У ЧАС ЧАРГОВАЙ СУСТРЭЧЫ

У другой дэкадзе снежня наш універсітэт у чарговы раз наведаў прафесар з Італіі Гаэтана Барлета. Ён выступіў з цыклам лекцый па псіхалогіі, удзельнічаў у абмеркаванні шэрагу пытанняў па больш паспяховай рэалізацыі праекта супрацоўніцтва Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны і Пізанскага універсітэта.

### ВІНШУЕМ!

***За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны старшая выкладчыца кафедры рускай літаратуры ЕМЯЛЬЯНАВА Святлана Пятроўна і асістэнт кафедры беларускай літаратуры ГЕНАШ Вера Савельеўна.***

✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻

## ПЕРАДНАВАГОДНІ КУЛЬТПАХОД

у абласны драматычны тэатр адбыўся 22 снежня, дзякуючы кіраўніцтву нашага універсітэта і прафкомам. 500 выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў паглядзелі камедыю Франсуазы Саган "Пацалуйце мяне, Генры!".

Прафком супрацоўнікаў змог аплаціць кошт 40 білетаў для актывістаў прафсаюзнай работы, прафком студэнтаў -- 30.

✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻✻

Конкурс

## НА ЭМБЛЕМУ УНІВЕРСІТЭТА

Рэктарат аб"яўляе адкрыты конкурс для ўсіх жадаючых на эмблему Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. За лепшыя эскізы ўстаноўлены грашовыя прэміі. Вынікі конкурсу прадугледжана падвесці да 10-га красавіка 1996 года. Эскізы эмблемы здаваць у рэдакцыю газеты "Гомельскі універсітэт" (галоўны корпус, п.1-18).

# ПАПОЎНІЦЦА ТЭХНІЧНАЯ БАЗА

Нялёгка выжываць у сённяшніх умовах вышэйшай школе, і разлічваць толькі на свае ўласныя сілы стала праблематычным. Выйсце са складанай сітуацыі бачыцца, у прыватнасці, у пошуку спонсараў. Так, кафедра аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі (АСАІ) рыхтуе спецыялістаў -- інжынераў для работы з сучаснымі ЭВМ, і якой вельмі неабходна навейшая тэхніка, заключыла некалькі гадоў назад дагавор аб доўгатэрміновым супрацоўніцтве з фірмай "БелКомДата" (г.Мінск), якая займаецца пастаўкамі вылічальнай тэхнікі, праграмных прадуктаў на беларускі рынак.



Нядаўна на кафедры АСАІ прайшоў трэці сумесны з названай фірмай семінар "Інфармацыйныя тэхналогіі. Мульцімедыа. Комплексныя сеткавыя рашэнні". У яго праграме была дэманстрацыя новых камп"ютэраў вядомых амерыканскай і англійскай фірм, сістэм ахоўнай сігналізацыі, відэаназірання і прамысловага тэлебачання вядучых фірм свету, сістэм мульцімедыа, комплексных сеткавых рашэнняў на базе навейшых тэхналогій.

З вялікай цікавасцю з прадстаўленай тэхнікай знаёміліся студэнты 1-5 курсаў спецыяльнасці АСАІ, выкладчыкі фізічнага, матэматычнага факультэтаў, прадстаўнікі розных зацікаўленых прадпрыемстваў і арганізацый г.Гомеля.

Прадстаўнікі фірмы "БелКомДата" перадалі ў якасці спонсарскай дапамогі калектыву кафедры камплектуючыя блокі і вузлы для камп"ютэраў для правядзення са студэнтамі лабараторных работ па вылічальнай тэхніцы.

**Т.ДУБЯК.**

**На здымку: знаёмства з тэхнічнымі навінкамі.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

# НАШЫ ГОСЦІ -- ПІСЬМЕННІКІ

На філалагічным факультэце адбылася сустрэча з пісьменнікамі і паэтамі Сяргеем Законнікавым, Генрыхам Далідовічам і Анатолем Зэкавым. Выкладчыкі, студэнты-першакурснікі цёпла сустрэлі сваіх гасцей.

Генрых Далідовіч расказаў пра часопіс "Маладосць" і сваю рэдактарскую дзейнасць у ім. Гаварыў ён і пра сучасны літаратурны працэс, маладых беларускіх аўтараў.

Сяргей Законнікаў, галоўны рэдактар часопіса "Полымя", зазначыў, што ў жыцці кіруецца такім прынцыпам, як сумленнасць. Мабыць таму "Полымя" застаецца лепшым рэспубліканскім часопісам. Вершы паэта мы слухалі з асаблівай увагай.

Анатоль Зэкаў, выпускнік філалагічнага факультэта нашага універсітэта, таксама чытаў свае вершы, але іншага характару. Гэта былі літаратурныя пародыі. Яны выклікалі шчыры смех у слухачоў.

Можна спадзявацца, што праз гэту сустрэчу мы нейкім чынам далучыліся да творчасці вядомых беларускіх літаратараў. І, безумоўна, яна была цікавай і карыснай для абодвух бакоў.

**Алена СТАРАВОЙТАВА,**
**студэнтка гр.БР-14**
**філалагічнага факультэта.**



(Выстаўкі)

# ДА СУСВЕТНАГА ДНЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

10 снежня думкі большай часткі гамяльчан былі заняты рэспубліканскімі выбарамі, нехта гаварыў аб штогадовай цырымоніі ўручэння Нобелеўскай прэміі і толькі зусім нямногія ўспомнілі пра Сусветны дзень правоў чалавека, традыцыя адзначаць які пачынаецца з 1948 года. У гэты дзень Генеральная Асамблея ААН зацвердзіла і абвясціла Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека, зрабіўшы першы гістарычны крок на шляху ўсеагульнага ўсведамлення годнасці і каштоўнасці асобы чалавека.

У гонар гэтай адметнай даты члены гомельскай ініцыятыўнай групы падтрымкі Міжнароднай Амністыі -- масавай міжнароднай праваахоўнай арганізацыі -- правялі шэраг экспазіцый плакатаў і літаратуры па правах чалавека: у абласной бібліятэцы імя Леніна, у фае галоўнага корпуса нашага універсітэта.

Акцыя, якая насіла інфармацыйна-папулярызацыйны характар, выклікала шырокі грамадскі рэзананс, паколькі праблема абароны правоў чалавека набывае ўсё большую актуальнасць для чалавецтва на парозе яго ўступлення ў новае тысячагоддзе.

Гомельская ініцыятыўная група падтрымкі МА, у рады якой уваходзяць журналісты, студэнты, выкладчыкі ГДУ і БелДУТа, медработнікі, людзі іншых прафесій, працягвае сваю работу і плануе правесці ў наступным годзе шэраг тэматычных акцый, у прыватнасці, па правах жанчын і дзяцей, накіраваных на аб"яднанне міжнароднай грамадскасці ў справе абароны правоў чалавека. Магчыма, для адной з такіх гуманных акцый свае сцэны прадставіць наша "альма матэр".

**А.САПОНЕНКА,**
**студэнт 5-га курса**
**філалагічнага факультэта.**



**У паўсядзённых клопатах і турботах, якіх так многа цяпер у нашым жыцці, не заўважаеш, што час бяжыць вельмі хутка. Гэта адчуваеш асабліва ў канцы года. І міжволі задаеш сабе пытанне: "А што прынёс ён табе, чым будзе памятны?" Некаторыя хутка знойдуць адказ на яго, бо лёс быў літасцівы да іх і падараваў штосьці прыемнае і радаснае, а многім, на жаль, наадварот, прынёс горкія расчараванні і страты. Але такі ўжо закон жыцця, і яго пакорліва ўспрымаеш.**

ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ

# КАЛІ ЁСЦЬ ПАЧУЦЦЁ АДКАЗНАСЦІ

Таццяна Курашова, студэнтка-чацвёртакурсніца эканамічнага факультэта, лічыць, што год 1995-ы стаў для яе па-асабліваму адметным: яе стараннасць у вучобе заўважана і па вартасці ацэнена. Дзяўчына ўдастоена стыпендыі імя Ф.Скарыны.

Некаторым такая падзея ў жыцці студэнткі можа падацца не вартай асаблівай увагі, будзённай, празаічнай. За ўсякім разе яны глядзяць на гэта з пункту гледжання сённяшняга дня. Маўляў, пры шырокім беспрацоўі ў краіне ў першыя яго рады могуць трапіць менавіта выпускнікі ВНУ, дык навошта старацца вучыцца на "выдатна", ці не лепш шукаць "цёплае" месца ў бізнесе, камерцыі... У Таццяны на гэты конт іншая думка: сапраўдныя веды будуць усё ж запатрабаваны, бо не заўсёды нашай эканоміцы знаходзіцца ў крызісным стане, надыдуць і для яе лепшыя часы.

Выбар Таццянай сваёй будучай прафесіі быў не выпадковым, а глыбока асэнсаваным. Спецыяльнасць "бухгалтарскі ўлік" яна лічыць самай распаўсюджанай і прэстыжнай на сённяшні дзень. Ёй цікава вывучаць законы развіцця эканомікі -- і айчыннай, і замежнай. Яна спадзяецца, што з атрыманнем дыплома зможа ўнесіць у іх свой маленькі, пасільны ўклад.



Пасля праходжання вытворчай практыкі ў ВА "Карал", дзе яна знаёмілася з работай бухгалтэрыі, у дзяўчыны засталіся неадназначныя ўражанні. Яе работнікі маюць справу з сухімі лічбамі, іх дзейнасць зведзена да аўтаматызму, рахункаводства ў чыстым выглядзе. Таццяне ж хочацца быць бухгалтарам-аналітыкам, добра валодаць замежнай мовай, і такія спецыялісты, улічваючы цяперашнія запатрабаванні, больш патрэбны не ў дзяржсектары, а на малых прадпрыемствах, фірмах і г.д. У іх ёсць больш умоў для творчай работы эканаміста.

Выдатная вучоба для Т.Курашовай -- не самамэта. Калі ўжо за што бярэцца, дык робіць гэта сур"ёзна і з адказнасцю. Так было і ў школе, якую закончыла з сярэбраным медалём, так працягваецца і зараз. Цяпер жа пачуццё адказнасці, па прызнанню дзяўчыны, у яе падвоілася.

Студэнцкае жыццё складаецца не толькі з вучобы, яно напоўнена таксама цікавымі знаёмствамі, сустрэчамі, дружбай, узаемаразуменнем паміж моладдзю. Менавіта такая цёплая, сяброўская атмасфера ўсталявалася ў групе, дзе вучыцца Таня. І гэта яна вельмі цэніць.

Аб тым, што гэтая дзяўчына яшчэ і жыццялюб, рамантык, сведчаць яе захапленні. Яна заўзятая тэатралка, можа нават двойчы схадзіць на спектакль, які ёй спадабаўся, любіць спорт, а асабліва -- аэробіку.

Хочацца пажадаць гэтай дзяўчыне далейшых поспехаў у вучобе, каб новы год зноў прынёс ёй толькі радасныя моманты.

**Т.ДУБЯК.**

**Фота У.Чысціка.**

# СТУДЭНТКА -- СОРАСАЎСКАЯ СТЫПЕНДЫЯТКА

*У дадатак да звычайнай грашовай падтрымкі, якая назначаецца студэнтам ВНУ, Сорасаўскую стыпендыю будзе атрымліваць пяцікурсніца біялагічнага факультэта нашага універсітэта Марына Крэгер. Пададзеныя ёй неабходныя дакументы для ўдзелу ў конкурсе на прысуджэнне Сорасаўскага гранта паспяхова прайшлі адбор, і цяпер на працягу 10 месяцаў дзяўчына зможа атрымліваць матэрыяльнае заахвочванне для далейшых поспехаў у вучобе і навукова-даследчай рабоце.*

**(Наш кар.)**

ПЕРАДНАВАГОДНЯЕ ІНТЭРВ'Ю

# ЯК ЖЫВЕШ, СОРАСАЎСКІ ПРАФЕСАР?

Менавіта з такога пытання пачалася наша переднавагодняя размова з прарэктарам па навуковай рабоце універсітэта доктарам фізіка-матэматычных навук А.М.Сердзюковым.

Усміхнуўшыся, Анатоль Мікалаевіч заўважыў:

-- Цяпер не тое, што было раней. -- І перайшоўшы на сур"ёзны тон, працягваў:

-- Глыбокі сацыяльна-эканамічны крызіс ў Беларусі, як і ва ўсіх краінах СНД, вельмі адчувальна адбіўся і на развіцці айчыннай навукі. Яна таксама перажывае цяжкія часы. Аднак у будучыню трэба глядзець з аптымізмам. Інакш нельга.

Так, у пачатку кастрычніка сёлетняга года мне ўручылі ганаровы дыплом "Сорасаўскі прафесар". Але так высока ацэнены не толькі мае навуковыя дасягненні. Тут пальма першынства, бясспрэчна, належыць рэктару нашага універсітэта акадэміку Беларускай акадэміі адукацыі, члену-карэспандэнту АН Беларусі Л.А.Шамяткову, цяперашняму кіраўніку шырока вядомай за межамі нашай краіны Гомельскай алгебраічнай школы. Ён таксама стаў уладальнікам дыплома "Сорасаўскі прафесар".

Адчуваю задавальненне і за сваіх больш маладых калег. Гранты "Сорасаўскі дацэнт" прысуджаны 36-гадоваму С.Ф.Каморнікаву з кафедры алгебры і геаметрыі, які мінулым летам паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю, і дэкану фізічнага факультэта І.В.Семчанку, а Л.П.Аўдашковай -- "Сорасаўскі аспірант".

Зусім нядаўна ў наш універсітэт прыйшло яшчэ адно прыемнае паведамленне. Прыбавілася "Сорасаўскіх дацэнтаў". Імі сталі С.М.Курылкіна з кафедры фізічнай метралогіі і В.М.Капшай з кафедры тэарэтычнай фізікі. Дарэчы, з Валерыем Мікалаевічам мы апублікавалі шэраг сумесных навуковых прац.

Не магу не адзначыць вельмі істотны факт. Па колькасці сорасаўскіх лаўрэатаў наш універсітэт пераўзыходзіць усе ВНУ Гомельшчыны разам узятыя і займае другую пазіцыю ў Беларусі.

**-- Чым можна растлумачыць такі поспех?**

-- Наяўнасцю даўно склаўшыхся і атрымаўшых сусветнае прызнанне навуковых школ -- па алгебры і крышталефізіцы. Ля вытокаў першай быў акадэмік О.Ю.Шмідт, яго справу працягваў акадэмік С.А.Чуніхін, на змену якому прыйшоў ягоны таленавіты вучань з вядомым цяпер у свеце імем Л.А.Шамяткоў. Узначальваемая мною ў апошнія гады школа крышталефізікі атрымала ў Беларусі шырокае развіццё пад кіраўніцтвам выдатнага вучонага акадэміка Ф.І.Фёдарава і знайшла прапіску ў Гомелі дзякуючы намаганням былога рэктара нашага універсітэта акадэміка Б.В.Бокуця.

Сваім галоўным дасягненнем мы лічым распрацоўку несупярэчлівай электрадынамікі гіратропных крышталяў.

У навуковай грамадскасці Захаду і многіх іншых краін нашы працы выклікаюць вялікую цікавасць і атрымалі высокую ацэнку. Сведчаннем таму -- праведзены ў кастрычніку 1993 года на базе фізічнага факультэта нашага універсітэта міжнародны семінар па радыёфізіцы крышталяў. Гэтымі днямі я атрымаў з ЗША прапанову ад рэдактара шырока вядомага бібліяграфічнага даведніка "Хто ёсць хто ў свеце" даслаць аб сабе звесткі для ўключэння ў гэты зборнік.

За апошнія пяць гадоў прадстаўнікамі нашай навуковай школы апублікавана,



пераважна ў замежных выданнях, звыш 100 навуковых прац. Усё часцей нашых вучоных запрашаюць выдавецтвы розных краін да рэцэнзавання навуковых артыкулаў. У прыватнасці, зусім нядаўна я атрымаў падзяку ад рэдакцыі аўтарытэтнага англійскага часопіса "Электрамагнітныя хвалі" за рэцэнзію навуковай працы вучоных-фізікаў з ЮАР.

Прызнаннем нашых навуковых дасягненняў стала запрашэнне на ўсемагчымыя міжнародныя канферэнцыі, сімпозіумы, семінары з поўнай аплатай усіх нашых камандзіровачных расходаў прымаючым бокам. З навуковымі дакладамі і паведамленнямі вучоныя-фізікі ГДУ выязджалі ў Бельгію, 4 разы -- у Францыю, у Галандыю, Фінляндыю, Аўстрыю, ЗША, Японію, Кітай, Чэхію, Польшчу, Балгарыю.

**-- З кім у Вас найбольш цесныя і плённыя навуковыя сувязі?**

-- Відавочна, з Інстытутам фундаментальных тэхналагічных даследаванняў Польскай Акадэміі навук. З яго вучонымі мы маем сумесныя публікацыі, у тым ліку адну работу манаграфічнага характару (у сааўтарстве з вядучым навуковым супрацоўнікам ГДУ Г.С.Міцюрычам).

**-- Анатоль Мікалаевіч, як вядома, сорасаўскія гранты і ганаровыя званні прысуджаюцца не толькі за значныя дасягненні ў навуцы, але і за поспехі ў падрыхтоўцы маладых спецыялістаў і навуковых кадраў. Што можаце сказаць аб асабістых паказчыках у гэтым напрамку?**

-- У цэлым імі задаволены. Пад маім навуковым кіраўніцтвам ужо абаронена 13 кандыдацкіх дысертацый. Трое маіх былых аспірантаў сталі дактарамі навук. Асобна хачу сказаць аб прарэктару па навуковай рабоце Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута В.В.Шапялевічу, таксама ўдастоенага сёлета звання "Сорасаўскі дацэнт". Васіль Васільевіч атрымаў дыплом доктара фізіка-матэматычных навук, які быў яму выдадзены Беларускай вышэйшай атэстацыйнай камісіяй за першым нумарам.

Дактарамі фізіка-матэматычных навук з"яўляюцца таксама былыя мае вучні цяпер галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі АНБ У.М.Белы, загадчык кафедры оптыкі нашага універсітэта С.С.Гіргель.

Адзначу і сваю выхаванку І.М.Ахраменка. Яна адной з першых у Беларусі стала ўладальніцай сорасаўскага гранта па навуцы.

**-- Што Вы маглі б сказаць аб практычных напрацоўках узначальваемай школы?**

-- У яе структуру ўваходзіць група лазернай тэхналогіі, якой кіруе вопытны спецыяліст А.Ц.Малашчанка. Раней яна працавала ў асноўным на ваенна-прамысловы комплекс. У крызісных умовах гэта група здолела паспяхова пераарыентавацца. Свае намаганні яна накіравала на распрацоўку аптычнага абсталявання для лазернай тэрапіі і ўжо мае адчувальныя вынікі.

**-- У пачатку гутаркі Вы, Анатоль Мікалаевіч, сказалі, што глядзіце ў будучыню з аптымізмам. Што маеце на ўвазе?**

-- Перш за ўсё тое, што калі-небудзь ды настануць лепшыя часы. І ў гэтым многае залежыць ад навукі. Не вычарпала свае рэзервы і наша навуковая школа. Ужо ў будучым годзе яе навуковы патэнцыял прыкметна ўзрасце. Да абароны падрыхтавалі доктарскія дысертацыі мае былыя аспіранты І.В.Семчанка, які, дарэчы, з"яўляецца намеснікам старшыні Беларускага аддзялення Сусветнага радыёфізічнага саюза, і М.А.Хіло, які працуе цяпер ў акадэмічным Інстытуце фізікі. Такой жа мэты павінен дасягнуць і Г.С.Міцюрыч.

Не магу не сказаць і пра тое, што сёлета пры нашым універсітэце БелВАКам адкрыты спецыялізаваны савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасці "Оптыка"

Упэўнены, што ў нас ёсць усе магчымасці набыць новыя сорасаўскія гранты, ганаровыя дыпломы.

**Гутарку вёў Ул.БАЛОГА.**
**На здымку: прафесар А.М.Сердзюкоў.**
**Фота У.Чысціка.**



СТРАНИЦЫ ИСТОРИИ

# ГОРОД НА ВЫСОКОМ ХОЛМЕ

(Окончание. Начало в №18)

Топонимист В.А.Никонов предполагал связь между названием города Гомель со значением слов "хомила, холм", однако с оговоркой "но это требует серьезной проверки". Реконструкция образа мышления основателей города, подкрепленная историческими параллелями, казалось бы, позволяет снять сомнение специалиста. Однако они всё же остаются. И прежде всего потому, что Гомель впервые в летописи упоминается под названием Гомий. Гомий не укладывается непосредственно в рассмотренную схему развития слова "могила". Так все же, каково происхождение названия города? Естественно допустить, что с течением времени истинное значение старославянского слова "могила, гомила" в смысле "холм" стали забывать, ибо все более прочное место в бытовой речи, по мере её обогащения и развития, отводилось "могиле" в её современном, весьма грустном представлении, а за природной возвышенностью по необходимости закрепилось другое слово -- "холм". Слово "холм" заимствовано из древнегерманского языка. Оно означает возвышение рельефа над ровной плоскостью и в этом смысле первоначально означало и собственно холм, и остров, по древне-исландски "холмр", который возвышается над водной гладью. На этих природных объектах воздвигались крепости, замки, затем дворцы. Поэтому в шведских названиях очень часто присутствует элемент "холм": Кренхольм, Кексхольм, Стокхольм. Итак, чем объяснить двойное название Гомеля? Постараемся вновь окунуться в эпоху закладки города и разобраться в ситуации, в которой оказались радимичи. В краю, обильном холмами, они должны были выделить тот или иной холм каким-то характерным признаком. В литературе о Гомеле неоднократно подчеркивается, что город расположен на большом холме. А что если и радимичи использовали то же самое определение приметного холма? Допустим, что сама природа подтолкнула радимичей дать своему городу название Великий Холм, с акцентом на величественность, высоту холма. Как должно было звучать это название восемьсот лет назад? Обратимся к одному из главнейших трудов основоположника славянской филологии Измаила Ивановича Срезневского (1812-1890). Прекрасный труд этот называется "Материалы для словаря древнерусского языка по письменным памятникам" X-XIV веков (1903г). На странице 547 третьего тома находим искомый и давно желанный ответ. Как близнецы, или точнее, как отец с сыном, стоят рядом друг с другом слова-синонимы и уже добрых сто лет ждут-не дождутся своего часа, чтобы поведать нам, откуда пошло-есть доселе загадочное двойное название города. Отдавая должное возрасту благообретённых слов, прочтем сперва наиболее древнее, а затем более молодое из них. Располагая их во временной последовательности, указанной И.И.Срезневским, устанавливаем, что во времена "старины дремучей" название большого, великого холма передавалось как Големъии (холм), а более позднее время -- Големль (холм). Почему? Ничего не поделаешь -- так развивался язык. Подобно тому, как наши предки для удобства их собственного произношения сократили П-лесков до Пскова, так и Го-ле-мий в летописи закрепился как Гомий. В наследство же последующим поколениям досталась обновленная форма слова Големъии, то есть Големль. Затем сработал уже знакомый механизм формирования языка, метатеза, и Големль закрепился и в языке, и в литературе как Гомель. Одно поколение людей менялось другим. Первоначальный смысл и Гомия, и Гомеля надолго затерялся в туманной глубине веков.

Итак, название города Гомель для наших предков означало "Великий Холм". В "Древностях Русского Языка" в 1850 годы Срезневский обратил внимание общественности на переходное состояние языка, которое прослеживалось по письменным памятникам XIV века. Он выявил тот невидимый и, как мы только что убедились, весьма непросто преодолимый для современного человека порог в развитии общего языка России, который отделяет более древнюю эпоху существования Гомия в пестрой семье самых разных языков от более поздней эпохи, при которой из этих языков, подобно букету, составляемому из разных цветов, начал образовываться современный русский язык. Насколько букет, великий и могучий, отличается от составляющих его цветов, видно хотя бы по тому факту, что до наших дней вынужденно осуществляются переводы "Слова о полку Игореве" с языка XII века на современный -- иначе, читая, многого не поймешь. По той же причине, по причине резкого различия языка смежных эпох, соратник И.И.Срезневского, уроженец острова Сааремаа в Эстонии, поэт, славист, академик Петербургской Академии Наук А.Х. Востоков (Остенекке) вынужден был составить двухтомный "Словарь церковно-славянского языка" (1858, 1861). Вчитаемся в примеры. "Тяжко ти головы кроме плечю, зло ти телу кроме головы" ("Слово о полку Игореве"). "Никто не может соли зобати, ни у печали смыслити" ("Слово Даниила Заточника"). Здесь сказано: "Тяжко голове без плеч, беда телу без головы", "Никто ведь не может ни пригоршнями соль есть, ни в горе разумным быть".

Пусть восстановленный смысл названия города Гомеля -- "Великий Холм" -- будет подарком, сюрпризом из Эстонии для жителей этого старинного города. Ведь недаром слово "друг" по-белорусски и по-эстонски звучит одинаково: "сябр" и "сыбер". Или это совпадение случайно?

**Ильмари ЛАХТИ, инженер-строитель.**

**Памяці У.Караткевіча**

# РОДНУЮ ЗЯМЛЮ ЛЮБІЎ УСЁЙ ДУШОЙ

*Быў. Ёсць. Буду.*
*Таму, што заўжды, як пракляты,*
*Жыву бяздоннай трывогай,*
*Таму, што сэрца маё распята*
*За ўсе міліярды двуногіх.*

У культурным жыцці Беларусі адзначалася нядаўна адметная дата -- 65-годдзе з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча.

Яго творчасць -- прыкметная з"ява ў беларускай літаратуры. Усім самым выдатным, што стварыў гэты пісьменнік, магла б ганарыцца любая сучасная сусветная літаратура.

Аб У.Караткевічу можна гаварыць доўга і шмат. Але найбольш трапна яго ахарактарызаваў Я.Брыль: "Нястомны вандроўнік і працаўнік, літаратар, які пастаянна і грунтоўна працуе над сабой, чалавек невычарпальнага светлага настрою, які ўмее смяяцца, як дзіця, усёй душой любіць родных людзей, родную зямлю".

Кажуць, што таленавітыя людзі таленавіты ва ўсім. Менавіта такой шматграннай асобай і быў Уладзімір Караткевіч. Ён -- паэт і празаік, драматург і перакладчык, публіцыст і і літаратурны крытык, кінасцэнарыст.

У яго паэзіі спалучаюцца рамантычнае і рэалістычнае, патрыятызм і гуманізм.

А хто не ведае Караткевіча-празаіка? Такія яго творы, як "Каласы пад сярпом тваім", "Чорны замак Альшанскі", "Дзікае паляванне караля Стаха" і інш . добра вядомы не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі.

Фільмы, створаныя па яго сцэнарыях, і зараз не губляюць свайго гледача.

Яго нарыс "Зямля пад белымі крыламі" стаў сапраўднай мастацкай энцыклапедыяй Беларусі.

Не мінула адметная дата і ГДУ. Прыхільнікі творчасці У.Караткевіча наладзілі вечарыну, прысвечаную юбілею У.Караткевіча. Студэнты філалагічнага факультэта Н.Архіпенка, А.Ксяндзова, С.Клюйко, Г.Русіновіч, В.Чэкан, Н.Шангіна падрыхтавалі міні-канцэрт, дзе чыталіся выдатныя вершы, прасякнутыя лірызмам празаічныя радкі, гучалі ўспаміны сучаснікаў аб пісьменніку. А ў другой палове вечара выступіў госць -- бард А.Мельнікаў. Ён выканаў шмат твораў, якія суправаджаліся цікавымі гісторыямі і незвычайнымі выпадкамі, звязанымі з іх напісаннем.

У аўдыторыі панаваў прыўзнёслы настрой. Усім прысутным было лёгка і радасна. І ў сувязі з гэтым, хочацца верыць, што нягледзячы на цяжкае сённяшнее жыццё, наша літаратура, наша мастацтва ды і ўвогуле культура дапамогуць людзям узняцца над будзённымі праблемамі і клопатамі, дапамогуць стаць хоць крышачку чысцей духоўна.

**Алена КАСТРЫЦА,**
**студэнтка 3-га курса**
**філалагічнага факультэта.**

**100 гадоў кіно**

# ЮБІЛЕЙНЫЯ КІНАСЮРПРЫЗЫ

28 снежня 1895 года ў Парыжы ў памяшканні "Гранд Кафе" на бульвары Капуцынаў адбылася першая публічная дэманстрацыя кінафільмаў, знятых братамі Луі і Агюстэнам Люм"ер на апараце, якія яны вынайшлі. Гэты знамянальны дзень прынята цяпер лічыць днём нараджэння кінематографа, які за сваю векавую гісторыю па праву заняў адно з вядучых месцаў у культурным жыцці чалавецтва.

Багацце выдатных мастацкіх фільмаў, якія з"явіліся ў юбілейны год на айчынным тэлеэкране, дзякуючы праграмам "Век кіно" (ГРТ), "Кінамарафон" (РТР), "Сінема" (ТБК), "Прэмія "Оскар" (НТБ), усяляе надзею на тое, што з культурай у нас не так ужо і дрэнна, як з усім астатнім. Сапраўднай падзеяй можна лічыць паказ па ТБ жамчужын еўрапейскага аўтарскага кіно: "Салодкага жыцця" Ф.Феліні, "Начнога парцье" Л.Кавані, "Берлін, Александэрплатц" Р.В.Фасбіндэра, "Караваджа" Д.Джармена і інш.

Як і ў мінулым годзе рэдакцыя студэнцкага часопіса "Скальд" склала дзесятку лепшых фільмаў года, паказаных на айчынным тэлеэкране ўпершыню.

**1."Салодкае жыццё".**
**2."Апошняе танга ў Парыжы".**
**3. "Караваджа".**
**4. "Начны парцье".**
**5. "Пунцовая жанчына"**
**6. "Разрыў".**
**7. "Хто баіцца Вірджыніі Вульф?"**
**8. "Непрыгожыя, брудныя, злыя".**
**9. "Фрэнсіс".**
**10. "Сэрца навыварат".**

Дзесятка складзена па выніках апытання, праведзенага сярод студэнтаў і выкладчыкаў філалагічнага факультэта.

Віншуем усіх чытачоў "Гомельскага універсітэта" з надыходзячым Новым годам і жадаем ім новых кінасюрпрызаў.

**В.БОРТНІК,**
**студэнт 5-га курса**
**філалагічнага факультэта.**

# ПРАБЛЕМЫ МОЛАДЗІ -- ПРАБЛЕМЫ ЧАСУ

З першага дня свайго існавання Рэспубліка Беларусь сутыкнулася з многімі праблемамі. Адной з іх з"яўляецца праблема арганізацыі вольнага часу моладзі.

Многія дзяржаўныя, камерцыйныя і грамадскія арганізацыі ставяць і спрабуюць вырашыць гэта пытанне. Але вельмі часта іх намеры застаюцца толькі добрым пажаданнем. На гэта ёсць як аб"ектыўныя, так і суб"ектыўныя прычыны. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх структур, накіраваная на арганізацыю вольнага часу моладзі, не дасягае належнага эфекту з-за адсутнасці неабходных фінансавых сродкаў, а камерцыйныя арганізацыі імкнуцца перш за ўсё атрымаць з гэтага прыбытак.

У той жа час праблему арганізацыі вольнага часу, працы і адпачынку моладзі паспяхова вырашае створаная ў 1994 г. у Віцебску Рэспубліканская асацыяцыя міжнародных маладзёжных абменаў і турызму (РАММОТ). За кароткі тэрмін свайго існавання асацыяцыя правяла карысныя і патрэбныя для моладзі мерапрыемствы: арганізавала ў летне-асенні перыяд работу студэнцкіх атрадаў. Каля 800 студэнтаў, акрамя працы ў рэспубліцы, выязджалі ў Малдову, у Крым; былі створаны і дзейнічалі лагеры бясплатнай працы і адпачынку моладзі, у якіх прымалі ўдзел не толькі беларускія, але і замежныя студэнты; "РАММОТ" з"яўляецца манапалістам па распаўсюджванню міжнародных студэнцкіх білетаў "ISIS" у Беларусі, якія даюць права на льготы пры паездках і адпачынку ў 93 краінах свету; была арганізавана летняя педагагічная практыка для студэнтаў у лагерах адпачынку навучэнцаў ў Крыме.

Для "РАММОТ" няма межаў!

Створаны і ствараюцца філіялы па ўсёй тэрыторыі СНД. Такі філіял адкрыты і ў Гомелі. Яго работа будуецца ў цесным узаемадзеянні з камітэтам па справах моладзі (старшыня В.А.Санчук) і ўпраўленнем па надзвычайных сітуацыях і абароне насельніцтва ад вынікаў аварыі на ЧАЭС (старшыня М.І.Ермакоў, нам.Л.У.Лісюк) Гомельскага аблвыканкома.

Мы спадзяемся, што Гомельскі філіял "РАММОТ", які ставіць задачу арганізацыі вольнага часу вучнёўскай і студэнцкай моладзі, асабліва ў час канікулаў, зацікавіць кіраўніцтва і прафсаюзныя камітэты навучальных устаноў, таму што рэалізацыя нашых планаў магчыма толькі дзякуючы сумесным намаганням.

За даведкамі і з прапановамі звяртацца ў камітэт па справах моладзі Гомельскага аблвыканкома.

**Я.ЭСМАНТОВІЧ,**
**дырэктар Гомельскага філіяла "РАММОТ".**



**Усміхнемся разам**

# НАВАГОДНІ СЕРПАНЦІН

МНЕ ДАЗВОЛІЛІ ЗРЭЗАЦЬ 8 ЁЛАЧАК ДЛЯ НОВАГА ГОДА!




**Парады Дзеда Мароза**

*-- Як хутка пахудзець?*

*-- Сесці на дыету: месяц харчавацца курыным булёнам з дапамогай кітайскіх палачак.*

☺☺☺

*Калі вас не задавальняе ваша зарплата, аддайце яе жонцы.*

**Аб"ява**

*"Учора ў прыватным аўтамабілі зялёнага колеру была забыта сумка з 20-ю бляшанкамі чорнай ікры. Просьба да вадзіцеля: "Каб ты падавіўся".*

**Рэклама**

*Купляйце ў нашым універмагу ўсё, што зможаце!*

**Пытанне рубам**

*-- Ці ёсць жыццё на Марсе?*

*-- Канешне, ёсць! "Марс" жа пакрыты тоўстым, тоўстым слоем шакаладу.*

**І такое бывае**

*У разгар навагодняй ночы ў "Хуткую дапамогу" паступае званок:*

*-- Хуткая? У нас тут адзін праглынуў штопар!*

*-- І што вы зрабілі?*

*-- Адкрываем відэльцам.*

☺☺☺

*Навагодняя ноч. Рэстаран. На гадзінніку -- без чвэрці гадзіна.*

*-- Афіцыянт, я ўжо паўгадзіны спрабую адрэзаць кавалачак ад гэтага шніцэля!*

*-- Можаце не спяшацца. Сёння мы зачыняем у сем гадзін раніцы.*

☺☺☺

*Новы год у адной сям"і. Гаспадар звяртаецца да жонкі:*

*-- Мне здаецца, што ў нас засталася бутэлька шампанскага з леташняга года?*

*-- Так, але я схавала яе на наступны Новы год.*

☺☺☺

*Пасля сустрэчы Новага года сябры вырашылі працягваць свята ў дамашняй абстаноўцы. Гаспадар ніяк не можа адчыніць дзверы.*

*-- Што за чартаўшчына? -- абураецца ён.*

*Тут падышоў Дзед Мароз і растлумачыў:*

*-- Не чартаўшчына, а прычына, і не адна, а цэлых тры. Па-першае, гэта не твая кватэра, па-другое, ключ устаўляеш не тым канцом. Па-трэцяе, гэта ключ ад пісьмовага стала.*

☺☺☺

*Пасля святочнага застолля на тралейбусным прыпынку стаіць грамадзянін, моцна ўхапіўшыся за фанарны слуп.*

*-- Чаго стаіш? -- пытаецца прахожы.*

*-- У тралейбус не пускаюць...*

*-- Дык і не дзіўна, -- зазначае прахожы, -- з такім таршэрам...*

☺☺☺

*Студэнт танцаваў з дзяўчынай і раптам упаў.*

*-- Вады, вады! -- крычыць дзяўчына.*

*Прыбеглі з вадой і паднеслі шклянку да рота пацярпеўшага. Студэнт павольна адкрыў вочы і прашаптаў:*

*-- І хлеба...*

☺☺☺

*Два галодныя студэнты сядзяць ў сябе ў пакоі. Выпіваюць.*

*-- Чуеш, адкуль гэта шашлыком запахла?*

*-- Дурань, здымі муху з цыгарэты.*

☺☺☺

*У сталоўцы студэнт забыўся ўзяць да чаю булачку і думае:*

*-- Пакуль схаджу за булачкай, хто-небудзь чай вып"е.*

*Напісаў на паперцы: "Я сюды плюнуў" і паклаў яе на шклянку з чаем.*

*Прыходзіць з булачкай, а на паперцы дапісана:*

*-- Я таксама плюнуў...*

☺☺☺

*Дзяўчына позна вечарам спускаецца ў падземны пераход. Дзесьці ўдалечыні гарыць адзінокая лямпачка. Раптам бачыць -- насустрач ідзе мужчына з шырока разведзенымі рукамі. Дзяўчына замітусілася, схапіла камень і з крыкам: "Дапамажыце!" кінула яго ў мужчыну.*

*Ён горка ўздыхнуў:*

*-- Эх, другі раз шкло дамоў данесці не магу...*

**Горкае прызнанне**

*Я больш на банкеты пасля абароны дысертацыі не хажу. Лепш хадзіць на памінкі.*

*-- Чаму?*

*-- Там хоць не пытаюць: "А ты калі?"*

**Анекдоты**

*Ідзе навагодні выпуск перадачы "Калыханка".*

*На экране дзядзька Валодзя флегматычна рэжа нажом ладны кавалак сала.*

*-- Гэта табе, Філя, а гэта табе, Сцяпашка.*

*-- А пра Хрушу ты не забыўся?*

*-- Няма ў нас больш Хрушы, мае маленькія сябры.*

😐😐😐

*У адным купэ едуць украінец і два негры-студэнты.*

*Украінец дастае хлеб, сала, памідоры і пачынае есці з апетытам. Заўважае галодныя вочы неграў.*

*-- Шо, хлопцы, хочаце істы?*

*Глытаючы слінкі, тыя ківаюць. Сусед дабрадушна разводзіць рукамі:*

*-- Ізвіняйтэ, хлопцы, банана нэма!*

😐😐😐

**Наша рэчаіснасць**

*-- Як не сорамна: такі здаровы, а просіш міласціну. Працаваць трэба!*

*-- Дык я ж пасля работы...*

☹☹☹

*Маці пытаецца ў свайго маленькага сына.*

*-- Хто навучыў цябе гаварыць гэтае дрэннае словы?*

*-- Дзед Мароз.*

*-- Дзед Мароз?*

*-- Так, мама, калі ён упаў, спатыкнуўшыся аб веласіпед у маім пакоі ў ноч напярэдадні Новага года.*

☺☺☺

• СПОРТ • СПОРТ • СПОРТ • СПОРТ

# ЁСЦЬ ВОЛАТ НА МАТЭМАТЫЧНЫМ!

Прыемна пісаць аб спартыўных дасягненнях студэнтаў нашага універсітэта, але яшчэ больш прыемна расказаць аб спартсменах-ветэранах.

Нядаўна ў г.Мінску прайшоў чэмпіянат Беларусі па пауэрліфтынгу (сілавое трохбор"е) сярод мужчын і ветэранаў.

У групе ветэранаў гонар нашай вобласці абараняў намеснік дэкана матэматычнага факультэта па выхаваўчай і спартыўна-масавай рабоце Уладзімір Аляксандравіч Галавач, які стаў чэмпіёнам у вагавай катэгорыі да 90 кг. Больш таго, ён не толькі зноў выканаў нарматыў кандыдата ў майстры спорту Рэспублікі Беларусь, але і на 25(!) кг апярэдзіў сярэбранага прызёра.

Студэнты матэматычнага факультэта не толькі могуць ганарыцца сваім намеснікам дэкана, але і браць з яго прыклад, а станоўчых якасцей у яго шмат. Верыцца, што Уладзімір Аляксандравіч яшчэ не раз нас парадуе поспехамі, чаго добрага, можа нават і на міжнароднай арэне.

# А ДЗЕ Ж ФАКУЛЬТЭТ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ?

Аб тым, што армрэстлінг (барацьба двух спартсменаў на руках за спецыяльным сталом) адзін з самых даступных відаў спорту, ведаюць не толькі спецыялісты. Вось толькі энтузіястаў мала.

Адзін з іх -- выкладчык кафедры фізічнага выхавання С.Пірагоў, які змог захапіць гэтым відам спорту студэнтаў агульных факультэтаў. І ёсць ужо спартыўныя дасягненні.

У актавай зале Гомельскага ПТВ-67 прайшло першынство вобласці па армрэстлінгу сярод юніёраў.

Студэнту геолага-геаграфічнага факультэта трэцякурсніку Ігару Коўгару не было роўных у вагавай катэгорыі да 60кг. Сярэбраныя ўзнагароды заваявалі пяцікурснік фізічнага факультэта Сяргей Касцюхін і студэнт 3 курса геолага-геаграфічнага факультэта Аляксандр Казловіч. Бронзавыя ўзнагароды ў перспектыўных першакурснікаў фізічнага факультэта Мікалая Філіпава і Юрыя Яроменкі.

Слова папроку трэба адрасаваць факультэту фізічнай культуры, які ігнаруе гэты від спорту. А можа тут няма каму арганізаваць студэнтаў?

У камандным заліку спартсмены Цэнтральнага раёна Гомеля, за які выступалі толькі нашы студэнты, занялі другое месца. На 10 ачкоў іх апярэдзіла каманда Савецкага раёна.

**В.МАРЧАНКА.**

ІНФАРМУЕ СЛУЖБА 02

# З НОВЫМ ШЧАСЦЕМ!

Студэнты, бадай, як ніхто іншы блізкія ў наш складаны час да слова "шчасце". Зразумела, у розных выпадках яно і сапраўднае і жартаўлівае, але ўсё роўна прыемна. Здаў на "дзяржаўную" сесію -- шчасце, удалося "спіхнуць" курсавую -- таксама шчаслівая падзея. Утварылася маладая сям"я, і ўсе жадаюць ёй шмат шчасця. Але калі мы кажам: "З Новым шчасцем!" у такія знамянальныя падзеі ў жыцці чалавека, як жаніцьба, Новы год, атрыманне кватэры, абарона дыплома і г.д., чамусьці не задумваемся, як лёгка "параніць" наша шчасце. Звон бакалаў, вясёлае застолле з гітарай пры свечках, цыгарэта ў руках, бенгальскія агні і хлапушкі, выбуховыя пакеты жартаўнікоў і выццё сірэн пажарных аўтамабіляў. Як гэта несумяшчальна! Але гэта рэальнасць.

Дзяржаўны пажарны нагляд усімі даступнымі сродкамі пераконвае ўсё насельніцтва, і студэнтаў у тым ліку (будучых педагагаў, юрыстаў, вучоных і кіраўнікоў вытворчасці): "Беражыце сябе, сваіх дзяцей, каханых і бацькоў, жыллё ад агню". У гэтым годзе ў многіх месцах рэспублікі праліліся слёзы над папялішчамі, нямала каштоўнасцей ператварылася ў попел. Напрыклад, у Чыгуначным раёне различваем закончыць год з меншай колькасцю пажараў супраць 277 выпадкаў у 1994г.

У гэтыя дні не хочацца гаварыць аб трагедыях, няхай лепш часцей гучыць жарт. "Пажарны спіць -- краіна багацее". Мы ж са свайго боку віншуем усіх вас з надыходзячым Новым годам, жадаем новага шчасця.

**І.ФІЛІПЕНКА,**
**малодшы інспектар АВПЧ Чыгуначнага раёна г.Гомеля.**

# НАРАДЗІЛІСЯ ДВАЙНЯТЫ

Нараджэнне на свет новага чалавека -- падзея для бацькоў радасная і хвалюючая. І няхай можна пачуць сёння, што жыццё стала надта складана і дзяцей гадаваць вельмі цяжка, усё ж жыццё не спыніць: людзі працягваюць кахаць, ствараць сем"і.

Асабліва адметным стане адыходзячы ў гісторыю 1995-ы год для маладой сям"і Чаркасавых, студэнтаў-завочнікаў нашага універсітэта. Нядаўна ў іх нарадзіліся двайняты -- хлопчык і дзяўчынка. Калектыў кафедры АСАІ, дзе бацька працуе лабарантам, шчыра віншуе яго з такім шчодрым прыбаўленнем у сямействе.

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

- -- гісторыі Беларусі -- дацэнта;
- -- беларускай мовы -- дацэнта;
- -- англійскай мовы -- заг.кафедры;
- -- тэарэтычнай фізікі -- дацэнта;
- -- агульнай фізікі -- дацэнта;
- -- оптыкі -- дацэнта;
- -- фізічнай метралогіі -- дацэнта;
- -- інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі -- дацэнта;
- -- фізвыхавання -- ст.выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул, Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221
Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.
За няякасны набор, вёрстку і памылкі фабрыка "Палесдрук" адказнасці не нясе.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 725.
Падпісана да друку 26.12.95.